Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне вышэйшых навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
__________________ А.І.Жук
―__” _____________2010 г.
Рэгістрацыйны №-ТД- ___/ тып.

# ГІСТОРЫЯ ФАЛЬКЛАРЫСТЫКІ

**Тыпавая вучэбная праграма**
**для вышэйшых навучальных устаноў**
**па спецыяльнасці 1-18 01 01 Народная творчасць (па напрамках)**
**напрамку 1-18 01 01-05 Фальклор**

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення
навучальных устаноў і кадраў
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
______________Н.Ю.Шмакава
―__” __________2011 г.

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік упраўлення
вышэйшай і сярэдняй
спецыяльнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
_____________ Ю.І.Міксюк
―__” ___________2011 г.

Старшыня Вучэбна-метадычнага
аб’яднання вышэйшых
навучальных устаноў
Рэспублікі Беларусь
па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
______________ Б.У.Святлоў
―__” ___________2011 г.

Рэктар дзяржаўнай
установы адукацыі
―Рэспубліканскі інстытут
вышэйшай школы”
____________ М.І.Дзямчук
―__” ___________2011 г.

Эксперт-нормакантралёр
_____________________
―__” ___________2011 г.

Мінск 2011

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Складальнік**

*А.А.Гулак,* старшы выкладчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”

**Рэцэнзенты:**

*кафедра* этналогіі і фалькларыстыкі ўстановы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М.Танка”;

*І.В. Казакова*, прафесар кафедры беларускай літаратуры і культуры ўстановы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны універсітэт”, доктар філалагічных навук

**Рэкамендавана да зацвярджэння ў якасці тыпавой:**

кафедрай этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № ад 2011г.);

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі ―Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № ад 2011 г.);

навукова-метадычным саветам па народнай творчасці (па напрамках) Вучэбна-метадычнага аб'яднання ВНУ Рэспублікі Беларусь па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № ад 2011 г.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за рэдакцыю *В.Б.Кудласевіч*

Адказны за выпуск *А.А.Гулак*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дысцыпліна ―Гісторыя фалькларыстыкі” садзейнічае глыбокаму засваенню студэнтамі ўсяго комплексу тэарэтычных і практычных ведаў у галіне фалькларыстыкі. Яна дазваляе сістэматызаваць тэарэтычныя і практычныя навуковыя веды, накопленыя фалькларыстыкай на працягу яе гістарычнага развіцця, сфарміраваць уяўленне пра гістарычнае развіццё фальклору, яго жанрава-відавы склад, ідэйна-тэматычны змест і паэтыку, асаблівасці генезісу і развіцця сістэмы родаў, відаў і жанраў, асэнсаваць асноўныя кірункі збірання, публікацыі і даследавання вусна-паэтычнай творчасці ў працах айчынных і замежных нарадазнаўцаў, сфарміраваць уяўленне пра найбольш значныя крыніцы і тэарэтычныя працы па фалькларыстыцы.

Выкладанне гісторыі фалькларыстыкі базіруецца на ведах, атрыманых студэнтамі пры вывучэнні філасофіі і гістарычных дысцыплін. Гэта дае магчымасць сістэмнага засваення і комплекснага ўсведамлення працэсу развіцця навукі аб фальклоры.

*Мэты вывучэння раздзела:*

– узбагаціць будучага спецыяліста ў галіне беларускай народнай культуры ведамі па гістарыяграфіі фальклору, ведамі пра спецыфіку яго збірання і вывучэння, абумоўленую яго унікальнай і самабытнай прыродай;

– сфарміраваць у будучых спецыялістаў ў галіне беларускай народнай культуры разуменне ролі асобы дзеяча культуры ў зберагатнні, даследаванні і трансляцыі фальклору.

*Задачы вывучэння раздзела:*

– ажыццявіць тэарэтычнае і практычнае азнаямленне студэнтаў з помнікамі фалькларыстыкі;

– забяспечыць засваенне студэнтамі асноўных паняццяў і тэрмінаў фалькларыстычнай навукі, азнаямленне з асноўнымі школамі і кірункамі фалькларыстыкі, метадамі фалькларыстычнага даследавання;

– сфарміраваць асновы даследчыцкай культуры студэнта, закласці тэарэтычную базу для развіцця і эфектыўнага прымянення даследчыцкіх навыкаў будучага спецыяліста ў галіне беларускай народнай культуры.

У выніку вывучэння дысцыпліны ―Гісторыя фалькларыстыкі” ў поўным аб'ёме студэнты павінны *ведаць*:

– сацыяльныя і гісторыка-культурныя перадумовы ўзнікнення навукі аб фальклоры, ролю пэўных дзеячоў, навуковых і грамадскіх установаў у яе фарміраванні;

– асноўныя кірункі збірання, публікацыі і вывучэння вусна-паэтычнай творчасці;

– агульнатэарэтычныя пытанні фалькларыстыкі, этапы яе развіцця, асноўных прадстаўнікоў і іх працы;

– асаблівасці тэарэтычнага асэнсавання фальклору на розных этапах

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

развіцця навукі і сучасныя праблемы фалькларыстыкі.

Студэнты павінны *умець*:

- прымяняць свае веды ў кантэксце сваёй прафесійнай дзейнасці;
- аналізаваць з’явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў;
- карыстацца навуковай і даведачнай літаратурай па пытаннях гісторыі фалькларыстыкі і звязаных з ёй дысцыплін.

*Метады і тэхналогіі навучання*

У ліку эфектыўных педагагічных метадаў і тэхналогій навучання, якія садзейнічаюць набыццю студэнтамі ведаў у галіне гісторыі фалькларыстыкі і фарміраванню ў іх вопыту самастойнага вырашэння разнастайных задач, вылучаюцца наступныя:

- тэхналогіі вучэбна-даследчыцкай дзейнасці;
- праектныя тэхналогіі;
- метад гістарыяграфічнага даследавання;
- метад тэксталагічнага аналізу прац XIX – пачатку XX ст.

*Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў* павінна развівацца ў наступных кірунках:

- азнаямленне з навуковай, хрэстаматыйнай літаратурай (веданне тэкстаў першакрыніц);
- выкананне гістарыяграфічных даследаванняў;
- падрыхтоўка вусных паведамленняў і прэзентацый.

Дысцыпліна ―Гісторыя фалькларыстыкі” разлічана на 228 аўдыторных гадзін, у тым ліку 122 гадзіны лекцыйныя, 22 – семінарскіх і 84 практычных заняткаў. Праграма прадугледжвае формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі і экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Назвы частак і тэм | | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | усяго | лек-цыі | сем. зан. | практ. зан. |
| **III семестр** | | | | | |
| Уводзіны. Прадмет і задачы дысцыпліны | | 2 | 2 | | |
| **Частка I. Тэарэтычныя асновы курса “Гісторыя фалькларыстыкі”** | | | | | |
| ***Тэма 1.*** | Гісторыя фалькларыстыкі як навуковая дысцыпліна | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 2.*** | Перыядызацыя беларускай фалькларыстыкі | 6 | 2 | 4 | |
| **Частка II. Навуковыя школы ў фалькларыстыцы** | | | | | |
| ***Тэма 3.*** | Перадумовы ўзнікнення фалькларыстычнай навукі | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 4.*** | Міфалагічная школа | 8 | 2 | 6 | |
| ***Тэма 5.*** | Міграцыйная школа | 4 | 4 | 2 | |
| ***Тэма 6.*** | Антрапалагічная школа | 8 | 4 | 2 | |
| ***Тэма 7.*** | Тэорыя саманараджэння сюжэтаў | 2 | 2 | 2 | |
| ***Тэма 8.*** | Гістарычная школа | 2 | 2 | 2 | |
| ***Тэма 9.*** | Структуралізм | 2 | 2 | | |
| **IV СЕМЕСТР** | | | | | |
| **Частка III. Станаўленне і развіццё беларускай фалькларыстыкі** | | | | | |
| ***Тэма 10.*** | Помнікі старажытнай літаратуры як крыніца фалькларыстычнага вывучэння | 4 | 2 | | |
| ***Тэма 11.*** | Помнікі гістарычна-мемуарнай літаратуры як крыніца фалькларыстычнага вывучэння | 4 | 2 | | |
| ***Тэма 12.*** | Развіццё сістэматычнай збіральніцкай і даследчай працы ў пачатку 19 ст. | 4 | 2 | 6 | |
| ***Тэма 13.*** | Збіранне і вывучэнне фальклору беларускімі і польскімі дзеячамі культуры ў сярэдзіне 19 ст. | 8 | 4 | 4 | |
| ***Тэма 14.*** | Навукова-арганізацыйная дзейнасць Рускага геаграфічнага таварыства | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 15.*** | Фальклорна-этнаграфічныя зборнікі 2-й палавіны 19 – пачатку 20 ст. | 10 | 4 | 6 | |
| **V СЕМЕСТР** | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Частка IV. Станаўленне і развіццё беларускай фалькларыстыкі ў 1920-1950-я гг.** | | | | | |
| ***Тэма 16.*** | Вывучэнне фальклору ў навуковых установах БССР у 1920-30-я гг. | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 17.*** | Характар фалькларыстычных даследаванняў ва ўмовах ідэалагічнага дыктату | 8 | 2 | 6 | |
| ***Тэма 18*** | –Савецкі фальклор”: жанры, тэмы, ідэі | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 19.*** | Вывучэнне фальклору ў кантэксце літаратуразнаўства. | 2 | 2 | | |
| **VI СЕМЕСТР** | | | | | |
| **Частка V. Развіццё беларускай фалькларыстыкі ў 1960-1990-я гг.** | | | | | |
| ***Тэма 20.*** | Этналігвістыка: гісторыя ўзнікнення. Этналінгвістычнае вывучэнне фальклору | 6 | 6 | | |
| ***Тэма 21.*** | Шматтомнае навуковае выданне БНТ ІМЭФ АН БССР | 2 | 2 | | |
| ***Тэма 22.*** | Даследаванні жыцця і дзейнасці збіральнікаў беларускага фальклору | 10 | 4 | 6 | |
| ***Тэма 23.*** | Гісторыка-тэарэтычнае вывучэнне беларускага фальклору | 8 | 2 | 6 | |
| **VII СЕМЕСТР** | | | | | |
| **Частка VI. Фалькларыстыка заходніх і паўднёвых славян** | | | | | |
| ***Тэма 24.*** | Нарадазнаўства ў замежных славянскіх народаў у канцы 18 – першай палавіне 19 ст. | | 4 | 4 | |
| ***Тэма 25.*** | Гістрарыяграфія і фалькларыстыка заходніх і паўднёвых славяну другой палавіне 19 – пачатку 20 ст. | | 4 | 4 | |
| ***Тэма 26.*** | Вывучэнне народнай культуры ў славянскіх сацыялістычных краінах (сярэдзіна 20 ст.) | | 2 | 2 | |
| ***Тэма 27.*** | Балгарская славістыка і фалькларыстыка | | 2 | 2 | |
| ***Тэма 28.*** | Польская славістыка і фалькларыстыка | | 2 | 2 | |
| ***Тэма 29.*** | Развіццё нарадазнаўства ў Югаславіі | | 2 | 2 | |
| ***Тэма 30.*** | Чэшская і славацкая навука пра народную культуру. | | 4 | 2 | |
| **VIII СЕМЕСТР** | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Частка VII. Сучасная заходнееўрапейская фалькларыстыка | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ***Тэма 31.*** | Сучасныя філасофскія тэорыі міфапаэтычнай творчасці: нямецкая псіхалагічная школа | | 2 | 2 | |
| ***Тэма 32.*** | Сучасныя філасофскія тэорыі міфапаэтычнай творчасці: сацыялагічная школа | | 2 | 2 | |
| ***Тэма 33.*** | Сучасныя філасофскія тэорыі міфапаэтычнай творчасці: функцыянальная тэорыя | | 2 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Уводзіны. Прадмет і задачы дысцыпліны

Апорныя тэрміны і паняцці: духоўная (нематэрыяльная) культура, вусна-паэтычная творчасць, альбо фальклор (у вузкім значэнні гэтага терміна), традыцыйнасць, калектыўнасць, варыятыўнасць, фальклорныя жанры, паэтыка, фалькларызм, постфальклор. Развіццё навуковых даследаванняў народнай творчасці як прадмет гісторыі фалькларыстыкі.

Задачы гісторыі фалькларыстыкі – даследаванне збірання, выдання і тэарэтычнага асэнсавання ўзораў фальклору, выяўленне гістарычных заканамернасцей развіцця навукі аб фальклоры, вывучэнне ўкладу асобных даследчыкаў і навуковых школ у развіццё і станаўленне навукі аб фальклоры.

### Частка I. Тэарэтычныя асновы курса “Гісторыя фалькларыстыкі”

### *Тэма 1.* Гісторыя фалькларыстыкі як навуковая дысцыпліна

Асноўныя напрамкі сучаснай фалькларыстыкі: філалагічны, этналагічны, гісторыка-сацыялагічны, мастацтвазнаўчы, музыказнаўчы, комплексны. Навуковая праблематыка гісторыі фалькларыстыкі. Праблема паходжання фальклору. Праблема навуковай школы. Праблема фіксацыі фальклорных тэкстаў. Праблема тэксталогіі фальклору. Праблема фальклорнай эдыцыі.

Раздзелы фалькларыстыкі: тэорыя фальклору, гісторыя фальклору, гісторыя фальклорных жанраў; гістарыяграфія фалькларыстыкі; арганізацыя і методыка збірання фальклору, сістэматызацыя архіўных фондаў; тэксталогія і прынцыпы выдання фальклору.

## *Тэма 2.* Перыядызацыя беларускай фалькларыстыкі

I. Перыяд ―перадфалькларыстыкі". Асобныя з'явы вуснай народнай творчасці знайшлі адлюстраванне ў помніках старажытнага пісьменства. Адсутнічае тэарэтычнае асэнсаванне фальклору, паняцце аб яго жанрах, відах ды інш. Узоры фальклору выкарыстоўваюцца несістэматычна.

II. Пачатак сістэматычнай збіральніцкай і даследчай працы ў канцы 18 – пач. 19 ст. Пад уплывам еўрапейскага рамантызму на мяжы стагоддзяў у славянскіх краінах абуджаецца цікавасць да гісторыі славян, іх мовы і паэзіі. Ставіцца праблема асэнсавання міфалогіі славян з мэтай даказаць адзінства паходжання славянскіх народаў. Дзеля гэтага ствараюцца гурткі і навуковыя таварыствы. Робяцца спробы напісаць праграмы вывучэння вусна-паэтычнай спадчыны.

III. Фарміраванне беларускай фалькларыстыкі як самастойнай навуковай дысцыпліны ў першай палове 19 ст. Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору польскімі і беларускімі даследчыкамі Фалькларыстычныя працы гэтага перыяду каштоўныя багатым фактычным матэрыялам, аднак большая частка яго перакладалася на польскую або рускую мовы, перапрацоўвалася і публікавалася недакладна.

IV. Актывізацыя ў другой палове 19 ст. фалькларыстычнай дзейнасці на навуковай аснове. Распрацоўка спецыяльных праграм, метадычных інструкцый, у якіх змяшчаліся патрабаванні да збіральнікаў, накіраваныя на дакладнасць запісаў, пашпартызацыю ды інш. Шырокі збор і публікацыя фальклорных і этнаграфічных матэрыялаў.

V. Эпоха фундаментальных фалькларыстычных зборнікаў і даследаванняў: канец 19 – пачатак 20 ст. ―Класічная фадбкдарыстыка": найвялікшыя здабыткі, багаты тэарэтычны задзел.

VI. Развіццё беларускай фалькларыстыкі ў навуковых установах БССР. Вялікае значэнне дзейнасці першай шматгаліновай навукова-даследчай установы БССР – Інстытута беларускай культуры. Ідэалагічны дыктат. Звужэнне метадалагічнай базы. Сацыялагічны (марксісцкі) метад. **С**тварэнне Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі — навуковага цэнтра ў галіне фалькларыстыкі. Публікацыя першых навучальных дапаможнікаў і падручнікаў па фальклору для ВНУ. Фундаментальныя выданні па фальклору і этнаграфіі беларусаў.

VII. Развіццё беларускай фалькларыстыкі ў 1990-я гг. – пач. 21 ст. Вывучэнне з'яў народнай культуры сумежжы фалькларыстыкі, лінгвістыкі, гісторыі літаратуры і этнаграфіі як сінтэз традыцыйна-фалькларыстычных падыходаў з метадалогіяй культурнай антрапалогіі, лінгвістыкі, семіётыкі.

# Частка II. Навуковыя школы ў фалькларыстыцы

## *Тэма 3.* Перадумовы ўзнікнення фалькларыстычнай навукі

Вопыт збірання фальклорных твораў і апрацоўка іх у творчасці пісьменнікаў, драматургаў, кампазітараў розных краін як перадумова



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўзнікнення фалькларыстычнай навукі. Дзейнасць асветнікаў 18 ст. у Еўропе як як фактар узнікнення навуковага інтарэсу да фальклору. Узнікненне ў рэчышчы рамантызму першага кірунку ў фалькларыстыцы і літаратуразнаўстве — міфалагічнай школы.

### *Тэма 4.* Міфалагічная школа

Рамантычная эстэтыка Ф. Шэлінга і бр. Шлегелей як філасофская аснова міфалагічнай школы. Трактоўка міфалогіі як натуральнай рэлігіі. Працы бр. Грым («Немецкая мифология», 1835). Тэорыя аб фальклоры як бессвядомай і безасабовай творчасці «народнай душы». Метад параўнальнага вывучэння фальклору. Міфалагічная школа ў краінах Еўропы: Германія (А. Кун, В. Шварц. В. Манхарт), Англія (М. Мюллер, Дж. Кокс), Італія (А. де Губернаціс), Францыя (М. Брэаль), Расія (А. Афанасьеў, Ф. Буслаеў, А. Мілер). Вывучэнне міфаў у працах Ф. Буслаева («Исторические очерки русской народной словесности и искусства», 1861). «Поэтические воззрения славян на природу» (1866—69) А. Афанасьева. Уплыў міфалагічнай школы на вывучэнне міфалогіі, збіранне фальклору ўсходніх славян, на развіццё тэарэтычнага вывучэння міфалогіі, фальклору і літаратуры. Прадстаўнікі міфалагічнай школы ў беларускай фальклырыстыцы: П. Шпілеўскі, А. Кіркор, П. Шэйн і інш.

### *Тэма 5.* Міграцыйная школа

Міграцыйная школа (тэорыя запазычання, тэорыя «вандроўных сюжетаў»). Навуковыя здабыткі Т. Бенфея як ідэйная аснова тэорыі. Тлумачэнне падабенства фальклору розных народаў пашырэннем – міграцыяй – паэтычных твораў. Прызнанне тэорыі ў эпоху ўмацавання культурных сувязей (2-я палавіна 19 ст.). Прыхільнікі міграцынай тэорыі – А. Пыпін, У. Стасаў, В. Мілер (90-я гг.) і інш. Увядзенне ў навуковы зварот значнай колькасці тэкставага матэрыялу. Фармальна-структурныя параўнанні сюжэтаў і матываў як стрымліваючы фактар развіцця тэорыі. Ігнараванне нацыянальнай і канкрэтна-гістарычнай спецыфікі фальклору.

### *Тэма 6.* Антрапалагічная школа

Антрапалагічная (этнаграфічная) школа. Фарміраванне ў сярэдзіне 19 ст. на аснове ідэй эвалюцыянізму. „Ідэнтычнасць чалавечага мыслення” ў кантэксце антрапалагічнай школы. Адыход ад філалагічнага падыходу пры аналізе першабытнай міфалогіі. Гіпотэзы пра анімізм, татэмізм, магію. Трактоўка тэорыі міфа як прадукта пазнавальнай дзейнасці людзей. Буйнейшыя прадстаўнікі антрапалагічнай школы: Дж. Фрэзер, Э.-Б. Тэйлар (Англія), В. Манхарт, Г. Узенер (Германія) і інш.

### *Тэма 7.* Тэорыя саманараджэння сюжэтаў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У межах антрапалагічнай школы ў Англіі ўзнікае «тэорыя саманараджэння сюжэтаў», ці этнаграфічная тэорыя. Пашырэнне яе ў сусветнай навуцы да пачатку 20 ст. Заснавальнікі тэорыі саманараджэння сюжэтаў — Э. Тайлор і А. Ланг. Тлумачэнне сходных з'яў у міфалогіі і фальклоры розных народаў агульнасцю псіхічных законаў і заканамернасцей духоўнай творчасці для ўсяго чалавецтва. Увядзенне ў фалькларыстыку паняцця «перажыткаў» (survivals) для абазначэння імі элементаў «першабытнай культуры». Тэндэнцыя да архаізацыі фальклору. «Тэорыя саманараджэння сюжэтаў» як адно з найвышэйшых дасягненняў фалькларыстыкі 19 ст.

### Тэма 8. Гістарычная школа

Гістарычная школа як адзін з найбольш уплывовых кірункаў у рускай фалькларыстыцы канца 19 – пачатку 20 ст. Тлумачэнне генезісу і семантыкі вусна-паэтычных твораў гістарычнымі рэаліямі. Вывучэнне помнікаў стражытнарускай пісьменнасці, былін, гістарычных песень, стварэнне гістарычнай геаграфіі рускага этнасу. Праблема "Фальклор і рэчаіснасць" як цэнтральная праблема ў разуменні мастацкай сутнасці фальклору, спецыфікі і лёсу яго асобных жанраў. Розныя погляды на праблему суадносін фальклору і гісторыі: У. Проп, Д. Ліхачоў, Б. Пуцілаў, Б. Рыбакоў і інш.

### *Тэма 9.* Структуралізм

Структуралізм як самая ўплывовая ідэйная плынь у гуманітарыстыцы 20 ст. Узнікненне структуралізма пад уплывам лінгвістыкі, семіётыкі, логікі, этналогіі. К. Леві-Строс – заснавальнік структуралізму, этнограф, сацыёлаг, культуролаг, даследчык міфалогіі і фальклору. Рэлятывісцкія трактоўкі К. Леві-Стросам культур архаічных ці традыцыйных грамадстваў. Вывучэнне славеснага мастацтва як знакавай сістэмы, элементы якой здольны да інтэграцыі і трансфармацыі. Паняцце «бінарных апазіцый». Даследаванні М. Бахціна, У. Пропа («Морфология сказки», 1928). Працы Ю. Лотмана, Е. Меляцінскага, У. Тапарова, Б. Успенскага і інш.

## Частка III.
## Станаўленне і развіццё беларускай фалькларыстыкі
### *Тэма 10.* Помнікі старажытнай літаратуры як крыніца фалькларыстычнага вывучэння

Першыя звесткі пра славянскі фальклор у летапісах і старажытнай літаратуры. Элементы традыцыйнай культуры ў павучаннях Еўфрасінні Полацкай (12 ст.), прытчах і малітвах Кірылы Тураўскага (12 ст.). Пісьмовыя звесткі пра беларускую народную творчасць у летапісах і хроніках 14-16 ст.: ―Баркалабаўскі летапіс”, ―Аповесць мінулых гадоў”. Народная творчасць у свецкай літаратуры эпохі Адраджэння. Фальклорная паэтыка твора славянскага паэта-лацініста М. Гусоўскага ―Песня пра зубра” (16 ст.). Стыхія народнай творчасці ў прадмовах і пасляслоўях Ф. Скарыны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(15-16 ст.).

## *Тэма 11.* Помнікі гістарычна-мемуарнай літаратуры як крыніца фалькларыстычнага вывучэння

Фальклор у летапісах, "водпісах", "дыярушах" і іншых старажытных матэрыялах і дакументах. Народная парэміялогія і фальклорная паэтыка ў помніках гістарычна-мемуарнай літаратуры: «Дзённік люблінскага сейма 1569 года», «Лісты» Ф. Кміты-Чарнабыльскага, «Дзённік» Ф. Еўлашэўскага. Публікацыі заходнееўрапейцаў пра Беларусь. Працы пісьменнікаў-краязнаўцаў другой палавіны 16 - першай палавіны 17 ст. Беларускія сямейныя абрады і ўзоры пахавальнага галашэння ў працы Я. Ласіцкага «Пра рэлігію, ахвярапрынашэнні, вясельныя і пахавальныя абрады русінаў, маскавітаў і татар» (1582). Уплыў беларускай вусна-паэтычнай творчасці на спадчыну С. Полацкага. С. Рысінскі – першы даследчык беларускай парэміялогіі. Зборнік «Тысяча восемсот польскіх прыказак» (1618).

## *Тэма 12.* Развіццё сістэматычнай збіральніцкай і даследчай працы ў пачатку 19 ст.

Узнікненне ў канцы 18 ст. у Рэчы Паспалітай навуковай цікавасці да народнай культуры. Першыя даследчыкі на Беларусі 18 ст., якія спрабавалі асэнсаваць гістарычнае развіццё беларускага краю і культуры беларусаў: А. Нарушэвіч, Ю. Нямцэвіч, Я. Патоцкі, С. Богуш-Сестранцэвіч, Г. Калантай. Дзейнасць Варшаўскага таварыства сяброў навук — першай Акадэміі навук Польшчы. Віленскі універсітэт – старэйшая навучальная установа былога Вялікага княства Літоўскага. Пашырэнне асветы на тэрыторыю Беларусі і Літвы. Праблема народнай культуры ў дзейнасці Віленскага універсітэта. Публікацыі даследаванняў па беларускай народнай культуры ў перыядычных выданнях. Узрастанне цікавасці да Беларусі і яе духоўнай культуры польскіх і рускіх навуковых колаў і грамадскасці пасля паўстання 1830-1831 гг. А.Міцкевіч пра беларускі фальклор, мову, яе гістарычную ролю ў Вялікім княстве Літоўскім.

## *Тэма 13.* Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору беларускімі і польскімі дзеячамі культуры ў сярэдзіне 19 ст.

Роля даследчыкаў-ураджэнцаў Беларусі ў фарміраванні беларускай фалькларыстыкі як самастойнай навуковай дысцыпліны (З. Даленга-Хадакоўскі, Я. Баршчэўскі, Л. Галамбёўскі, Р. Зянькевіч, А. Рыпінскі, У. Сыракомля, Я. і К. Тышкевічы, Я.Чачот і інш.).

З. Даленга-Хадакоўскі – піянер славяназнаўства, збіральнік і даследчык беларускага, рускага, украінскага, польскага фальклору. Праграма комплекснага вывучэння культуры славян. Значэнне міфалогіі ў даследаванні традыцыйнай культуры славян. Архівы З. Даленга-Хадакоўскага. Я. Баршчэўскі – аўтар твора «Шляхціц Завальня або



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларусь у яе фантастычных казках і апавяданнях» (1853). Я. Чачот і яго выданне беларускіх народных песень «Вясковыя песні з-над Нёмана і Дзвіны» (1837-46). А. Рыпінскі. Фальклорны матэрыял у яго працы «Беларусь» (1840). Я.Тышкевіч – краязнаўца, археолаг, грамадскі дзеяч, даследчык народнай культуры. Вусна-паэтычныя творы ў яго працы «Апісанне Барысаўскага павета» (1847). «Народныя песні пінскага люду» Р. Зянькевіча (1851). Характар публікацый гэтага перыяду: літаратурная пераапрацоўка, пераклад на польскую або рускую мовы. Белетрызаваныя нарысы як асноўная форма фальклярыстычных даследаванняў. П. Шпілеўскі – публіцыст, даследчык міфалогіі і фальклору: «Беларускія паданні» (1846-1852), «Даследаванне аб ваўкалаках на падставе беларускіх павер'яў» (1853), «Падарожжа па Палессі і беларускім краі» (1853-1855).

## *Тэма 14.* Навукова-арганізацыйная дзейнасць Рускага геаграфічнага таварыства

Сацыяльныя ўмовы развіцця беларускай фальклярыстыкі 1860-х гадоў. Навуковая дзейнасць Рускага геаграфічнага таварыства: пачатак прафесійнага фальклорна-этнаграфічнага даследавання Беларусі. Публікацыя на старонках перыядычных выданняў РГТ класічных даследаванняў па беларускаму фальклору. Прграма для збору этнаграфічна-фальклорных матэрыялаў (1847). Стварэнне ў 1866 г. Паўночна-Заходняга аддзела РГТ. Мэтанакіраваны характар заняткаў па фальклярыстыцы і этнаграфіі.

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 15.* Фальклорна-этнаграфічныя зборнікі 2-й палавіны 19 - пачатку 20 ст.

З'яўленне фальклярыстычных зборнікаў, якія змяшчалі розныя віды і жанры народнай творчасці. Фарміраванне навуковага паняцця каляндарна-абрадавага фальклору. Разгортванне сістэматычнай працы па зборы фальклору і этнаграфічных матэрыялаў на падставе спецыяльнай праграмы («Просьбы») П.Шэйна (1867, шмат разоў перавыдавалася). «Беларускія народныя песні» (1873) і «Матэрыялы для вывучэння побыту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» (т. 1—3, 1887—1902) П. Шэйна.

І. Насовіч – фальклярыст і лінгвіст. «Зборнік беларускіх прыказак» (1867) і «Беларускія песні» (1873) І.Насовіча. П. Бяссонаў – славяназнаўца і фальклярыст. ―Беларускія песні" (1871) П. Бяссонава. «Беларускае вяселле і вясельныя песні» (1888) і «Песні пінчукоў» (1895) М. Доўнар-Запольскага. «Смаленскі этнаграфічны зборнік» У. Дабравольскага (ч. 1-4, 1891-1903). «Простанародныя прыкметы і павер'і...» (1897), «Нячысцікі...» (1907) і «Беларускія песні-частушкі» (1911) М. Нікіфароўскага. «Люд беларускі...» М.Федароўскага (т. 1-8, 1881-1997). «Матэрыялы ддя вывучэння творчасці і побыту беларусаў» Я. Ляцкага (1898). Тэарэтычная праца па беларускай фальклярыстыцы «Беларуская этнаграфія» рускага даследчыка А. Пыпіна (1887). Е. Раманаў – аўтар фундаментальнага шматтомнага выдання па

фальклору «Беларускі зборнік» (вып. 1—9, 1885—1912). Значэнне дзейнасці Е. Раманава для вывучэння культуры і гісторыі беларускага народа. Зборнік А. Сержпутоўскага «Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў» (1911). Інфарматары-казачнікі А. Сержпутоўскага. Я. Карскі – заснавальнік беларускага мовазнаўства. Даследаванне жанраў беларускага фальклору ў фундаментальнай працы Я. Карскага «Беларусы» (Т. 3, вып. 1, 1916).

## Частка IV. Станаўленне і развіццё беларускай фалькларыстыкі ў 1920-1950-я гг.

### *Тэма 16.* Вывучэнне фальклору ў навуковых установах БССР у 1920-30-я гг.

Значэнне дзейнасці шматгаліновай навукова-даследчай установы БССР – Інстытута беларускай культуры. Стварэнне ў 1924 г. пры Інбелкульце Цэнтральнага бюро краязнаўства, у 1927 г. – фальклорнай камісіі пры кафедры этнаграфіі Беларусі. Стварэнне ў 1929 г. Акадэміі навук Беларусі і сектара этнаграфіі і фальклору пры Інстытуце гісторыі. Яго вялікая роля ў развіцці беларускай фалькларыстыкі. Тэарэтычныя даследаванні М. Нікольскага «Міфалогія і абрадавасць валачобных песень» (1931) і «Жывёлы ў звычаях, абрадах і вераваннях беларускага сялянства» (1933). Выданне Р. Шырмы «Беларускія народныя песні» (1929). Ідэалагічны ціск на змест збіральніцкай і навуковай дзейнасці фалькларыстаў у 30-я гг. XX ст. Знішчэнне фальклорнага архіва АН Беларусі ў час вайны.

### *Тэма 17.* Характар фалькларыстычных даследаванняў ва ўмовах ідэалагічнага дыктату

Захаваўшы ў першае паслякастрычніцкае дзесяцігоддзе разнастайнасць кірункаў і метадаў, фалькларыстыка тым самым захавала здольнасць да творчага развіцця. Пасля 1929 г. вывучэнне фальклору ў СССР паступова на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў скоўваецца ідэалагічным дыктатам. А сам фальклор трактуецца як сродак улады ў падпарадкаванні асобных сацыяльных класаў і грамадства ў цэлым татальнай ідэалагізацыі. У 1930-я гг. нанесены моцны ўдар па традыцыйная сялянскай культуры, разбуранай у выніку калектывізацыі рэпрэсій у адносінах да кулакоў, прымусовага высялення вялікай колькасці сялянскіх сямей – носьбітаў народнай традыцыі.

Метадалогія вывучэння вуснай народнай творчасці зводзіцца да марксісцка-ленінскага (класавага, сацыялагічнага) метаду. 1940-я гг. – барацьба з ―буржуазным касмапалітызмам”. Абагульняючая праца па гістарыяграфіі фалькларыстыкі М.К. Азадоўскага ―Гісторыя рускай фалькларыстыкі” (1958).

### *Тэма 18.* “Савецкі фальклор”: жанры, тэмы, ідэі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Трактоўка мастацкага метаду фальклору: сацыялістычны рэалізм і рэвалюцыйны рамантызм як вышэйшыя мастацкія каштоўнасці савецкай эстэтыкі. Народнасць фальклору як пралетарска-сялянская творчасць. Ігнараванне жанраў, створаных –эксплуататарскімі" і –лакейска-мяшчанскімі" элементамі (авантурная казка, жорсткі раманс, прыпеўка). Атэізм як ідэалагічная ўстаноўка. Антырэлігійныя і –антыпапоўскія" песні, казкі і прыказкі. Цэнзураванне твораў фальклору, якія захавалі традыцыйныя міфапаэтычныя ўяўленні. Вобразы натхняльнікаў рэвалюцыі, народных мсціўцаў і змагароў. Услаўленне Леніна, Сталіна, Чапаева, Кірава. Аўтарскія фальсіфікацыі іператэкстоўкі. Тэарэтычныя працы Ю.М. Сакалова.

### *Тэма 19.* Вывучэнне фальклору ў кантэксце літаратуразнаўства.

Тэндэнцыя да збліжэння фалькларыстыкі з літаратуразнаўствам, якая адзначылася яшчэ ў 1930-ягг., мела пазітыўныя вынікі. Распрацоўка і рэалізацыя філалагічных прынцыпаў выдання тэкстаў народнай паэзіі. Грунтоўнае філалагічнае вывучэнне помнікаў народнай паэзіі, заснаванае на пынцыпах іх жанравай спецыфікі і на ўліку такіх прыкмет як вуснасць, традыцыйнасць, варыятыўнасць, калектыўнасць, ананімнасць. Працы А.С. Фядосіка, Г.А. Барташэвіч, А.С. Ліса, Л.М. Салавей, Г.А. Пятроўскай, А.І. Гурскага. Аднак вывучэнне фальклору з літаратуразнаўчых пазіцый мела і негатыўныя наступствы. Былі выведзены з прадметнага поля фалькларыстыкі значныя пласты матэрыялу, ідэя сінкрэтызму народнай культуры (злітнасць, нерасчлянёнасць функцый) часткова страціла свой сэнс. Неразуменне прынцыповай нераўназначнасці славеснага фальклору і літаратуры – сутнаснай, функцыянальнай, структурнай, - выклікала пэўнае ігнараванне архаічнага фальклору і вяло да аднабаковай карціны жанравага поля фальклору.

## Частка V. Развіццё беларускай фалькларыстыкі ў 1960-1990-я гг.

### *Тэма 20.* Этналігвістыка: гісторыя ўзнікнення. Этналінгвістычнае вывучэнне фальклору

Этналінгвістыка як навуковы кірунак на мяжы лінгвістыкі, этналогіі і фалькларыстыкі. Узнікненне ў пачатку 20 ст. у ЗША. Тэарытычныя палажэнні сфарміраваны ў працах В. Гумбальдта, Б. Маліноўскага, Дзюркгейма, Ф. Бааса. Савецкая (расійская) этналінгвістыка прадстаўлена пераважна школай М. Талстога. олингвистика представлена преимущественно школой Н.И. Толстого. Асноўныя палажэнні гэтай школы – перанос лінгвістычных метадаў на даследаванні народнай культуры славян у спалучэнні з акцэнтам на гітсарычны (дыяхранічны) і генетычны аспект даследаванняў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Архаічныя пласты народнай культуры як самастойны аб’ект навуковага даследавання ўпершыню разглядаюцца ў працах Маскоўска-Тартускай школы па другасных мадэлюючых сістэмах ў канцы 1960-х – пачатку 1970-х гг. У пачатку 1980-х гг. балта-славянская духоўная культура робіцца аб’ектам вывучэння навукоўцаў Маскоўскага Інстытута славяназнаўства (Інстытута славяназнаўства і балканістыкі) АН СССР. Фундаментальныя працы Маскоўска-Тартускай семіятычнай школы (Ю. Лотман, У. Тапароў, Вяч. Іванаў ды інш.), Маскоўскай этналінгвістычнай школы М. і С. Талстых (Т. Агапкіна, В. Бялова, А. Тапаркоў ды інш.), створаныя ў 1960-1990-х гг., як метадалагічны арыенцір для беларускіх даследчыкаў архаічнай народнай культуры.

### *Тэма 21.* Шматтомнае навуковае выданне БНТ ІМЭФ АН БССР

Стварэнне ў 1957 г. Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі – навуковага цэнтра ў галіне фалькларыстыкі. Шматтомнае выданне зводу беларускай народнай творчасці БНТ з 1970 да 2000 г. склала 45 тамоў. Прынцыпы выдання зводу і структура тамоў. Гісторыка-тэарэтычнае вывучэнне жанраў і відаў славянскага фальклору: замоў, дзіцячага фальклору, веснавой паэзіі, казак, сямейна-абрадавай паэзіі, народнай сатыры, каляндарна-абрадавай паэзіі, пазаабрадавай лірыкі, баладных песень і інш. Перавыданне БНТ (новая серыя).

### *Тэма 22.* Даследаванні жыцця і дзейнасці збіральнікаў беларускага фальклору

Даследаванні жыцця і дзейнасці збіральнікаў беларускай народнай паэтычнай творчасці: «М.Я. Нікіфароўскі» В. Бандарчыка і І. Чыгрынава (1960), «Е.Р. Раманаў» В. Бандарчыка (1961), «А.Я. Багдановіч» Ю. Пшыркова, «А.К. Сержпутоўскі» В. Бандарчыка і А. Фядосіка (абедзве 1966), «Міхал Федароўскі» Я. Саламевіча, «П.В. Шэйн» М. Новікава (абедзве 1972), «Не пагасла зорка: Жыццёвы і творчы шлях М. А. Янчука» Г. Пятроўскай (1987), «З любоўю да народа: З жыцця і фальклорна-этнаграфічнай дзейнасці Дз.Г. Булгакоўскага і П.П. Дземідовіча» А.Гурскага (1989), «Збіральнікі» У. Васілевіча, «З душой славяніна: Жыццё і дзейнасць З. Я. Даленгі-Хадакоўскага» А. Аксамітава і Л. Малаш (абедзве 1991), «Святло далёкай зоркі» У. Касько (1997) «Бяссонаў і Беларусь. Пошукі і знаходкі» В.І. Скідана (2008), «Пётр Аляксеевіч Бяссонаў: славяназнаўца і фалькларыст» А.А. Гулак (2008) і інш. Неабходнасць уліку сацыяльна-гістарычнага кантэксту для разумення значэння прац збіральнікаў беларускага фальклору.

### *Тэма 23.* Гісторыка-тэарэтычнае вывучэнне беларускага фальклору



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гісторыка-тэарэтычнае вывучэнне жанраў і відаў беларускага фальклору: замоў, дзіцячага фальклору, веснавой паэзіі (Г. Барташэвіч), фальклорнай прозы (Л. Бараг, К. Кабашнікаў, І. Крук, А. Цітавец), сямейна-абрадавай паэзіі, народнай сатыры (А. Фядосік, Л. Малаш, В. Захарава, У. Сысоў), каляндарна-абрадавай паэзіі (А. Ліс, Р. Кавалёва), пазаабрадавай лірыкі (В. Цішчанка, А. Гурскі, У. Васілевіч, Г. Пятроўская), баладных песень (Л. Салавей) і інш.

Рост цікавасці да міфапаэтычнай народнай спадчыны ў 1990-я – пачатку 2000-х гг. Працы па міфалогіі У. Васілевіча, А. Ненадаўца, І. Казаковай, Т. Шамякінай. Этнасеміятычныя даследаванні Т. Валодзінай, Л. Дучыц, Э. Зайкоўскага, Р. Кавалёвай, У. Лобача, С. Санько, І. Швед.

## Частка VI. Сучасная заходнееўрапейская фальклารыстыка

***Тэмы 24-30.*** Нарадазнаўства ў замежных славянскіх народаў у канцы 18 – першай палавіне 19 ст. Гістрарыяграфія і фальклларыстыка заходніх і паўднёвых славяну другой палавіне 19 – пачатку 20 ст. Вывучэнне народнай культуры ў славянскіх сацыялістычных краінах (сярэдзіна 20 ст.). Балгарская славістыка і фальклларыстыка. Польская славістыка і фальклларыстыка. Развіццё нарадазнаўства ў Югаславіі. Чэшская і славацкая навука пра народную культуру. Філасофскія тэорыі міфапаэтычнай творчасці: нямецкая псіхалагічная школа, сацыялагічная школа, функцыянальная тэорыя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНАЯ ЧАСТКА

**Крытэрыі ацэнкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў**

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Веданне студэнтам асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 2 (два) | Устойлівая фіксацыя ў памяці студэнта асобных фактаў, з'яў і тэрмінаў вывучаемай дысцыпліны. |
| 3 (тры) | Аднаўленне студэнтам часткі праграмнага матэрыялу па памяці. Ізаляванасць ведаў па асобных тэмах, персаналіях, крыніцах. |
| 4 (чатыры) | Недастаткова сістэмнае ўсведамленне студэнтам вывучаемай дысцыпліны (сацыяльна-гістарычных працэсаў, персаналій, фактараў уплыву на іх развіццё і інш.). Веданне навуковай і даведачнай літаратуры па гісторыі фалькларыстыкі. |
| 5 (пяць) | Усведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне аб'ектаў вывучэння з тлумачэннем момантаў пераемнасці і ўзаемаўплываў), веданне перыядызацыі гісторыі беларускай фалькларыстыкі.<br>Наяўнасць неістотных памылак. |
| 6 (шэсць) | Сістэмнае ўсведамленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу. Веданне асноўнай навуковай літаратуры па дысцыпліне.<br>Наяўнасць неістотных памылак. |
| 7 (сем) | Поўныя, трывалыя веды. Разгорнутае апісанне і тлумачэнне аб'ектаў вывучэння, раскрыццё сутнасці з'яў і фармуліроўка вывадаў. Уменне аналізаваць помнікі гісторыі фалькларыстыкі з улікам набытых ведаў.<br>Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 8 (восем) | Поўныя, трывалыя, глыбокія веды. Свабоднае аперыраванне вучэбным матэрыялам дысцыпліны. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Веданне асноўнай і дадатковай літаратуры па дысцыпліне. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| Адзнака | Паказальнікі адзнакі |
|---|---|
| 9 (дзевяць) | Сістэмнае веданне студэнтам сацыяльна-гістарычных перадумоў ўзнікнення навукі аб фальклоры, ролю пэўных дзеячоў, навуковых і грамадскіх устаноў у яе фарміраванні. Раскрыццё сутнасці тэарэтычных пытанняў, пацверджанне аргументамі і фактамі. Уменне аналізаваць з'явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па пытаннях гісторыі фалькларыстыкі і звязаных з ёй дысцыплін. Наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 10 (дзесяць) | Глыбокае асэнсаванне вывучаных з'яў гісторыі навукі. Разуменне студэнтам агульнатэарэтычных пытанняў беларускай фалькларыстыкі, актуальных праблем навукі. Уменне прымяняць свае веды ў кантэксце прафесійнай дзейнасці, аналізаваць з'явы традыцыйнай духоўнай культуры з улікам набытых ведаў, карыстацца навуковай літаратурай па пытаннях гісторыі фалькларыстыкі і звязаных з ёй дысцыплін. |

**Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі**

- ✓ падрыхтоўка пісьмовых кантрольных работ (заданняў);
- ✓ напісанне рэфератаў па асобных раздзелах дысцыпліны;
- ✓ напісанне дакладаў на навуковыя канферэнцыі па асобных тэмах дысцыпліны;
- ✓ выступленні студэнтаў на семінарах па распрацаваных імі тэмах;
- ✓ вуснае апытанне студэнтаў падчас заняткаў;
- ✓ пісьмовы экзамен, вусны экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Беларуская* фалькларыстыка: Збіранне і даследаванне народнай творчасці ў 60-х гадах XIX – пачатку XX ст. / Аўт. Г. А. Пятроўская, І. К. Цішчанка, У. А. Васілевіч і інш. Пад рэд А. С. Фядосіка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1989. – 332 с.
2. *Беларускі* фальклор: энцыклапедыя: у 2 т. / рэдкал.: Г.П.Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн.: Бел. энцыкл., 2005–2006. –
3. *Беларусы*: у 12 т. / Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Бел. навука, 1995. – Т. 3: Гісторыя этналагічнага вучэння / В. К. Бандарчык [і інш.]. — 1999.— 365 с.
4. *Васілевіч*, У. А. Збіральнікі. / У. А. Васілевіч. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – 189 с.
5. *Каханоўскі,* Г.А. Беларуская фалькларыстыка : эпоха феадалізму / Г.А.Каханоўскі, Л.А.Малаш, К.А.Цвірка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. –
6. *Цішчанка*, І. К. Да народных вытокаў: Збіранне і вывучэнне беларускага фальклору ў 50-60-я гады XIX ст. / І. К.Цішчанка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1986. – 248 с.
7. *Фядосік*, А. С. Беларуская савецкая фалькларыстыка / А.С.Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987. –


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*


1. *Беларускія* народныя песні. Са зборнікаў П. Шэйна. Склад. К. Кабашнікаў. – Мн. : Дзяржвыд. БССР, 1962. – 429 с.
2. *Богданович*, А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк / А. Е. Богданович. – Гродна: Губ типография, 1895. – 186 с.
3. *Гілевіч*, Н. С. З клопатам пра песні народа / Н. С. Гілевіч. – Мн. : Выд.

БДУ, 1970. – 160 с.

4. *Гулак*, А.А. Пётр Аляксеевіч Бяссонаў: славяназнаўца і фалькларыст / А.А. Гулак. – Мінск : Паркус плюс, 2008. – 110 с.
5. *Живописная* Россия: Отечество наше в его зем., ист., плем., экон. и быт. значении: Литов. и Белорус. Полесье: Репринт. воспроизведение изд. 1882 г. – Мінск : БелЭн, 1993. – 550 с.
6. *Земцовский*, И.И. Искатели песен / И. И. Земцовский. – Л. : Музыка, 1967. – 110 с.
7. *Казакова, І.В.* Беларускі фальклор: вучэб. дапам. / І.В.Казакова. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2007. – 309 с.
8. *Карскі*, Я.Ф. Беларусы / Яўхім Карскі. – Мінск : МГА "Бел. кнігазбор", 2001. – 637 с. (Беларускі кнігазбор. Серыя 2, Гісторыка-літаратурныя помнікі).
9. *Каханоўскі*, Г.А., Каханоўскі, А.Г.: Руплівец нашай старасветчыны: Яўстах Тышкевіч / Г.А.Каханоўскі, А. Г.Каханоўскі. – Мінск.: Навука і тэхніка, 1992. – 63 с. (Нашы славутыя землякі).
10. *Романов*, Е.Р. З гісторыка-археалагічнай спадчыны : выбраныя творы / Е.Р.Раманаў. – Магілёў : МДУ, 2006. – 237 с.
11. *Рыгор* Шырма / Склад. В.Дз. Ліцвінка. – Мінск : Беларусь, 1990. –
12. *Саламевіч*, І. У. Міхал Федароўскі / Янка Саламевіч. – Мн. : Выш. шк., 1972.
13. *Скідан*, В. І. Бяссонаў і Беларусь. Пошукі і знаходкі / Васіль Скідан. – Мн. : Звезды Гор, 2008. – 90 с.
14. *Фальклор* у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / [Уклад., сістэмат. тэкстаў і камент. В.І. Скідана, А.М. Хрушчовай. – Мінск : Бел. навука, 1997. – 342 с. – (Беларуская народная творчасць).
15. *Федароўскі*, М. Люд беларускі. Вяселле. / М. Федароўскі. - Уклад., прадм. і пер. з польскай мовы І.У. Саламевіча. – Мінск : Полымя, 1991. – 142 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**16.** *Фядосік*, А. С. Ілюзорнасць і сапраўднасць: «Белыя плямы» ў гісторыі фалькларыстыкі 20—30-х гг. / А.С. Фядосік. – Мінск : 1991, –

**17.** *Г.І. Цітовіч* ва успамінах сучаснікаў : Зборнік / Музыч. тав-ва БССР. – Мінск : 1990. – (Выдатныя дзеячы беларускай музычнай культуры).

**18.** *Цыхун*, А. П. Акадэмік з вёскі Лаша Я.Ф.Карскі : Краязн.-біягр. нарыс / А.П.Цыхун. – Гродна, 1992.

**19.** *Швед*, І. А. Уводзіны ў фалькларыстыку : вучэбна-метадычны дапаможнік : у 2 ч. / І. А. Швед ; Брэсцкі дзярж. ун-т імя А. С Пушкіна. – Брэст : БрДУ. 2009. – Ч. 1. – 92 с.

**20.** *Шлюбскі*, А. Этнаграфічная дзейнасць Дабравольскага / Ал. Шлюбскі. – Мінск : 1928. –

**21.** *Шырма*, Р. Р. (1892—1978). Песня – душа народа : публіцыстыка, фальклор, музыка, літ. / Рыгор Шырма. – Мінск : Маст. літ., 1976. –

**22.** *Ягич*, В. История славянской филологии / И. В. Ягич. – Репр. изд. – М.: Индрик, 2003. – 960 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ